Источник: **«Рэспубліка» - 2012-07-17**

## «Землякі вы мае, землякі…»

*Іван СТАДОЛЬНІК*

**Докшыцкай зямлі было Богам наканавана ўсцешыць Беларусь талентамі**

Хачу распавесці пра свайго земляка акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі, кавалера ордэна Айчыны трэцяй ступені Віктара Сямёнавіча Буракова, заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі, аўтара больш як дзвесце пяцьдзясят навуковых прац, якія ў асноўным прысвечаны галіне спектральнага аналізу квантавай электронікі нізка- і высокатэмпературнай плазмы.

Віктар Сямёнавіч нарадзіўся ў 1931 годзе на Ушаччыне, але лёсам звязаны з маёй Докшыччынай.

У розныя гады мой таленавіты зямляк і сябра быў намеснікам дырэктара Інстытута фізікі, узначальваў Доследна-вытворчае прадпрыемства па вырабе ўнікальных фізічных прыбораў Акадэміі навук СССР, а пазней стаў акадэмікам — сакратаром аддзялення фізікі і інфарматыкі і адначасова дырэктарам Інстытута малекулярнай і атамнай фізікі Нацыянальнай акадэміі Беларусі.

Пазнаёміўся я з Віктарам Сямёнавічам асабіста толькі ў 1980 годзе, калі пераехаў у Мінск. Ён ужо быў прафесарам, працаваў у Акадэміі навук БССР, а я — рэдактарам аддзела літаратуры ў часопісе «Вожык».

У той год адбылося шмат узнагароджванняў заслужаных людзей, працаўнікоў прамысловых прадпрыемстваў, калгасаў, саўгасаў, дзеячаў літаратуры і культуры, навукі і тэхнікі. Сярод ушанаваных быў і Віктар Сямёнавіч. Яму прысвоілі званне члена-карэспандэнта Акадэміі навук БССР і званне заслужанага дзеяча навукі БССР.

Ва ўсіх сродках масавай інфармацыі паведамлялася аб адзначаных дзяржавай людзях. Не застаўся ў баку і часопіс «Вожык». Я, як рэдактар аддзела літаратуры, прапанаваў надрукаваць маё інтэрв’ю з членам-карэспандэнтам Акадэміі навук заслужаным дзеячам навукі і тэхнікі БССР Віктарам Бураковым.

Віктар Сямёнавіч падрабязна расказаў пра сваё жыццё-быццё, працу. Я — пра сябе. Фрагмент яго аповеду з сяброўскім шаржам вожыкаўскага мастака быў апублікаваны ў пераднавагоднім нумары часопіса пад загалоўкам «І фізікі — лірыкі»:

«…Здаўна спрачаюцца людзі: ці правільна гэта падзяляць людзей на фізікаў і лірыкаў? Як хто, а мы, фізікі, да гэтых спрэчак, думаю, ніякага дачынення не маем, бо аднолькава любім і фізіку, і лірыку, і яшчэ жарты, хаця займаемся мы надзвычай сур’ёзнымі справамі. Хіба ж вам жартачкі, злавіць ды і трымаць, колькі хочаце, кавалачак самага што ні на ёсць сонца — плазму, якая мае дзясяткі мільёнаў градусаў гарачыні. А паспрабуй яшчэ вымерай тую гарачыню. Любы тэрмометр імгненна пыхне як порах.

Фізікі нашага інстытута першыя ў свеце знайшлі метад вымяраць састаў плазмы. Называецца той метад метадам лазернай дыягностыкі.

Кожны год у нашых беларускіх фізікаў абавязкова бывае нейкае новае адкрыццё. І калі ўспомніш, што яшчэ зусім нядаўна, да Вялікага Кастрычніка, добрая палавіна нашага брата-беларуса і распісацца не ўмела, то ад радасці, гонару за свой народ і фізікам хочацца вершы складаць. Так што і мы часта бываем лірыкамі.

Вядома, такога высокага лірычнага настрою ў нашых фізікаў не было б, каб не адчувалі паўсядзённых клопатаў партыі і ўрада аб развіцці навукі, аб нас, вучоных. Вось і сёлета ў мяне двайная, можна сказаць, радасць — стаў членам-карэспандэнтам Акадэміі навук БССР і атрымаў ганаровае званне заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі БССР. А таму і двайны лірычны настрой, і двайная зарадка на новы, 1981 год…»

У апошнія гады ў мяне ўсё часцей і часцей з’яўляецца нейкая незразумела пільная патрэба перачытваць асобныя старонкі кнігі «Памяць. Докшыцкі раён. Гістарычна-дакументальная хроніка». У нашых мясцінах нарадзілася і рабіла першыя крокі колішняя настаўніца, пісьменніца і жонка слыннага пісьменніка, загубленага сталінскім рэжымам, Максіма Гарэцкага Леаніла Усцінаўна Чарняўская.

Усе чацвёра дзяцей настаўнікаў Пятра Віктаравіча і Валянціны Аляксандраўны Маркаўцоў сталі вядомымі мастакамі не толькі ў нас, у Беларусі, але і за яе межамі: Віктар, Валя, Галя і Аня нарадзіліся і раслі ў маёй роднай вёсцы Янкі.

Назаўсёды звязаны лёсам з Докшыччынай і лёс народнага паэта Беларусі Пімена Панчанкі. Пра гэта я ўпершыню даведаўся ад яго самога ўтой год і нават дзень, калі мяне прынялі ў Саюз пісьменнікаў СССР і БССР. Адным з першых мяне павіншаваў Пімен Емяльянавіч. Паціскаючы руку, сказаў:

— Ад душы віншую і рады за цябе, зямляк.

Па праўдзе кажучы, я крыху сумеўся ад таго, што славуты паэт назваў мяне земляком. З біяграфіі, апублікаванай у шматлікіх кнігах пісьменнікаў, я памятаў, што паэт нарадзіўся ў Таліне. Аказалася, што яшчэ ў дваццатым годзе мінулага стагоддзя бацькі паэта пераехалі на Бягомльшчыну, адкуль будучы народны паэт паехаў вучыцца ў Мінскі педінстытут.

На Докшыччыне нарадзіліся і выраслі вядомыя беларускія пісьменнікі Юрась Свірка, Алесь Ставер, Эдуард Зубрыцкі, Фёдар Палачанін і многія іншыя. Нават сённяшні прэзідэнт Украіны Віктар Фёдаравіч Януковіч мае докшыцкія карані. Яго продкі ўвесь час жылі ў вёсцы Янукі, якая месціцца за некалькі кіламетраў ад маіх Янкоў. Дзядуля Януковіча перад Кастрычніцкай рэвалюцыяй паехаў ва Украіну, у Данбас, на заробкі. Там з сям’ёй і застаўся.

Думаю, маёй малой радзіме было Богам прызначана ўсцешыць Беларусь талентамі. Яна дала Беларусі акадэмікаў Паўла Андрэевіча Апанасевіча, лаўрэата дзяржаўных прэмій СССР і БССР, аўтара больш як дзвесце пяцьдзясят навуковых прац і дзвюх манаграфій, Віктара Сямёнавіча Буракова, дзясяткі дактароў і кандыдатаў навук.

Радуе мяне, што многія з сённяшняга маладога пакалення глыбока і сур’ёзна асвойваюць розныя навукі. Вось і мой унук Ваня Сюльжын заканчвае факультэт радыёфізікі і электронікі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, адначасова займаецца з групай адораных юных фізікаў ліцэя БДУ. Яго група неаднаразова займала прызавыя месцы, а ў гэтым годзе — першае ў рэспубліканскім турніры і прызавое месца ў еўрапейскім, які адбыўся ў Аўстрыі, узнагаро-джана дыпломам III ступені, мела гонар удзельнічаць у сусветным турніры ў Германіі.

Унук рыхтуецца да паступлення ў магістратуру. Спадзяюся, што і з яго атрымаецца вучоны-фізік.